| | | 
|---|---|
| | **ВЫДАТАК** |
| 1. На друкаваньне часопісі | 6.988 р. 33 к. |
| 2. Ганарар | 6085 р. 58 к. |
| 3. Распаўсюджваньне часопісі | 600 р. 93 к. |
| 4. Аплата пэрсаналу | 920 р. 31 к. |
| 5. Плата за памяшканьне пад склад часопісі | 180 р. |
| 6. Іншыя дробныя выдаткі | 62 р. 55 к. |
| **УСЯГО:** | 14.837 р. 70 к. |

Астача на 1–е кастрычніка 669 руб. 34 кап.

СТАРШЫНЯ ЗГУРТАВАНЬНЯ *[подпіс]* (Чорны)
СКАРБНІК К. Атраховіч
СЭКРАТАР А. Бабарэка

## № 21

### Ліст у рэдакцыю часопісі „Узвышша“

У № 3 за 1928 г. маскоўскай газэты „Читатель и Писатель“ быў выдрукаваны артыкул „Литературная Белоруссия“, падпісаны ініцыяламі „А. Б.“.

У гэтым артыкуле больш за ўсё вылучана ўвага групе „Маладняк“ і пісьменьнікам, якія ўваходзяць зараз у групу „Полымя“.

Нейкі грамадзянін А. Селіванаўскі ў № 5 маскоўскае часопісі „На литературном посту“ ў артыкульчыку наогул недарэчным і бязглуздым (з якой прычыны, мабыць, яго і пахвалілі ў „Літаратурным дадатку“ да „Сав[ецкай] Бел[арусі]“ за І/ІІІ–28) піша наступнае (ст. 84).

„Р. S. Есть такой печатный орган в Москве „Читатель и писатель“. В № 3 этого органа помещена статья некоего А. Б. — „Литературная Белоруссия“. Статья А. Б., вызвавшая ряд соответсвующих острот делегатов конференции (нарады беларускага „Маладняка“), превозносит группу „Узвышша“ и констатирует окончательное распадение „Маладняка“. Товарищи из „Маладняка“ послали в редакцию письмо и протест. Письмо не печатается. Комментарии излишни. А. С.“.

З гэтае заўвагі вынікае меркаваньне, што артыкул напісаны некім з узвышаўцаў. У дадатак да ўсяго сказана, некаторыя асобы ў Менску дэшыфруюць ініцыялы А. Б. — Адам Бабарэка.

У адказ на такія ганебныя спосабы „змаганьня“ на літаратурным фронце, мушу заявіць наступнае.

1. У згаданым артыкуле „Литературная Белоруссия“, да якога я ніякага дачыненьня ня маю, слова „Узвышша“ ні разу не ўспамінаецца.

2. Артыкул, як гэта добра вядома, напісаны адным з членаў ЦБ „Маладняка“, якому я прапаную ў бліжэйшыя дні даць у друку паведамленьне, у якім ён павінен зазначыць:

а) сваё сапраўднае прозьвішча;

б) мотывы, паводле якіх ён карыстаўся гэтымі ініцыяламі, ведаючы загадзя, што вынікае з гэтага.

*А. Бабарэка*